# КІРАЎНІК УРАДА ДАЛАЖЫЎ ПРЭЗІДЭНТУ АБ ПЕРАГАВОРАХ З РАСІЙСКІМ ПРЭМ'ЕРАМ

**1 кастрычніка 1997 года адбылася рабочая сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь С.С.Лінгам.**

С.С.Лінг падрабязна далажыў аб сустрэчы са Старшынёй Урада Расійскай Федэрацыі В.С.Чарнамырдзіным і разгледжаных на ёй пытаннях. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі быў дэталёва праінфармаваны аб выніках развіцця народнай гаспадаркі Беларусі за 9 месяцаў 1997 года, поспехах у развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, фінансава-бюджэтнай дзейнасці, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У ходзе сустрэчы С.С.Лінга і В.С.Чарнамырдзіна было абмеркавана выкананне беларуска-расійскіх дамоўленасцяў у пытаннях тэхнічнага крэдыту, сумеснага фінансавання сістэмы проціпаветранай абароны, развіцця мытнай інфраструктуры і ўмацавання беларуска-расійскай граніцы. С.С.Лінг далажыў А.Р. Лукашэнку, што дасягнута прынцыповая дамоўленасць аб складанні расійскім бокам графіка выплаты да канца 1997 года раней выдзеленага Беларусі крэдыту ў суме 500 млрд. расійскіх рублёў. Асноўная сума будзе пералічана Яраслаўскаму АТ «Аўтадызель» і Растоўскаму заводу сельскагаспадарчага машынабудавання. Прадугледжваецца, што 150 млрд. расійскіх рублёў паступяць на рахункі гэтых прадпрыемстваў ужо ў кастрычніку 1997 года.

С.С.Лінг далажыў кіраўніку дзяржавы аб маючым адбыцца разглядзе ва ўрадзе праекта бюджэту на 1998 год. Прэзідэнт у цэлым адобрыў прадстаўленыя прапановы, разам з тым падкрэсліў, што абмеркаванне бюджэту павінна праходзіць у атмасферы дзелавітасці і публічнасці. Мяркуецца, што ў другой палове кастрычніка праект бюджэту на 1998 год будзе прадстаўлены на разгляд кіраўніку дзяржавы.

С.С.Лінг праінфармаваў А.Р.Лукашэнку аб ходзе падрыхтоўкі народнай гаспадаркі краіны да работы ў асенне-зімовых умовах. Было адзначана, што ў асноўным увесь комплекс работ ужо завершаны, створаны адпаведныя запасы паліва і энерганосьбітаў, якія не ніжэй узроўню мінулага года.

Прэзідэнт краіны даручыў ураду трымаць гэту работу пад пастаянным кантролем, каб забяспечыць нармальнае функцыянаванне ўсіх галін народнай гаспадаркі і гарадскіх камунальных службаў. А.Р.Лукашэнка асабліва адзначыў, што нельга дапусціць у гэтай важнай справе ніякай расхлябанасці, безадказнасці і марнатраўства.

**БЕЛТА.**